



# Гродзенскі універсітэт

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года ● № 8 (269) ● 1 кастрычніка 1999 года, пятніца
Выходзіць адзін раз на месяц ● Распаўсюджваецца бясплатна


# 3 КАСТРЫЧНІКА — ДЗЕНЬ НАСТАЎНІКА. САСВЯТАМ, ПЕДАГОГІ СЁННЯШНІЯ І БУДУЧЫЯ!

## САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА

На пасяджэнні першага ў гэтым навучальным годзе Савета універсітэта разглядалася пытанне «Аб выніках уступных экзаменаў ва універсітэт у 1999 годзе». З дакладам выступіў намеснік старшыні Прыёмнай камісіі І.П. Мартынаў. Больш падрабязны аналіз вынікаў работы Прыёмнай камісіі чытайце на 4-5 старонках гэтага нумару газеты.

З інфармацыяй аб выніках работы Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі выступіла загадчык навучальнага аддзела Л.У.Бярэйшык.

У раздзеле «рознае» былі разгледжаны надзённыя пытанні.

## АБМЕРКАВАНА РЭКТАРАТАМ

На першым у гэтым навучальным годзе пасяджэнні рэктарата разглядаўся шэраг надзённых пытанняў. Аб рэалізацыі плана мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню 60-годдзя ўз'яднання народаў Заходняй Беларусі і БССР зрабіў паведамленне загадчык выхаваўчага аддзела Г.М. Кабяк. Затым рэктарат заслухаў яго інфармацыю аб пасяленні ў інтэрнаты і правядзенні студэнцкіх прафсаюзных справаздачна-выбарчых сходаў.

Аб сітуацыі на гуманітарным факультэце, які створаны па даручэнні міністэрства адукацыі з мэтай аказання падтрымкі тым, хто пажадаў перайсці на вучобу з філіяла камерцыйнага інстытута сучасных ведаў, выступіла дэкан факультэта Т.А. Бадзюкова. Падчас пасяджэння рэктарата - 6 верасня - на факультэце былі распрацаваны рабочыя планы па ўсіх спецыяльнасцях, працягвалася заключэнне дагавароў з будучымі студэнтамі. Арганізацыйных пытанняў узнікла шмат, але ўсе яны паступова вырашаюцца. 13 верасня на факультэце пачаліся аўдыторныя заняткі.

✳ ✳ ✳

На чарговым пасяджэнні рэктарата былі абмеркаваны пытанні аб планаванні навучальнага працэсу, аб прэзідэнцкіх стыпендыях, аб падрыхтоўцы рукапісаў да выдання, аб структурным змяненні ўступных экзаменаў.

Як паведаміла прарэктар па навучальнай рабоце Л.В. Рычкова, толькі ўсе кафедры фізіка-тэхнічнага факультэта і факультэта фізічнай культуры здалі ў навучальны аддзел нагрузку па кафедрах. Часткова здалі яе факультэты псіхалогіі і педагогікі і юрыдычны. Астатнія гэтага ў першай дэкадзе верасня яшчэ не зрабілі.

Л.В. Рычкова зрабіла паведамленне аб кандыдатурах на атрыманне імянных стыпендый. Двое студэнтаў прадстаўлены на атрыманне Прэзідэнцкай стыпендыі. Іх прозвішчы мы паведамім пазней, калі пытанне будзе канчаткова вырашана.

Затым дэканы факультэтаў выказалі свае прапановы і пажаданні аб структурным змяненні ўступных экзаменаў у наступным годзе.

У раздзеле «рознае» былі разгледжаны надзённыя пытанні.

**ВІНШУЕМ!**
**Ніну Паўлаўну МІКЛАШЭВІЧ з юбілеем! Моцнага Вам здароўя, шчасця і даўгалецця!**
**Савет ветэранаў.**

## КАНДЫДАТУ НАВУК - 21 ГОД



**17 верасня ў нашым універсітэце адбылася неардынарная падзея: аспірант Леанід Станіслававіч Сабалеўскі ва ўзросце 21 года абараніў кандыдацкую дысертацыю.**

**Л.С. Сабалеўскі «сэканоміў» чатыры гады: у школе, ва універсітэце ды і ў аспірантуры ён здаваў экзамены экстэрнам. Зараз ён атрымаў запрашэнне ад Інстытута матэматыкі НАН Беларусі.**

**Віншуем Л.С. Сабалеўскага і яго навуковага кіраўніка і настаўніка І.П. Мартынава з гэтым поспехамі!**

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

**Нагадваем, калі і каго можна павіншаваць з юбілеем.**

✳ 1 кастрычніка - **Юзэфу Пятроўну САЦЭВІЧ** - прыбіральшчыцу вучэбнага корпуса № 1.

✳ 9 кастрычніка - **Сяргея Мікалаевіча СНАПА** - старшага выкладчыка кафедры крымінальнага права, працэсу і крыміналістыкі.

✳ 9 кастрычніка - **Валерыя Фаміча КОМАРА** - намесніка дэкана фізіка-тэхнічнага факультэта.

✳ 10 кастрычніка - **Усцінню Кузьмінічну НЕДАВУ** - лабаранта кафедры замежных моў.

✳ 23 кастрычніка - **Івана Якаўлевіча ЛЕПЕШАВА** - прафесара кафедры беларускай мовы.

✳ 23 кастрычніка - **Любоў Анатольеўну ШЫХАНЦОВУ** - інжынера першай катэгорыі навуковага аддзела.

✳ 24 кастрычніка - **Аляксея Аляксандравіча ЯРОМІНА** - рабочага вучэбнага корпуса № 2.

✳ 25 кастрычніка - **Уладзіміра Мікалаевіча БОРМАТАВА** - загадчыка кафедры музыкальнага інструмента.

✳ 26 кастрычніка - **Таццяну Уладзіміраўну МАСЛОЎСКУЮ** - вартаўніка лабараторнага корпуса.

## ЦИТАТА НОМЕРА:

***«Уважение других дает повод к уважению самого себя».***

***Р. Декарт.***



ПОСТАЦІ ВНУ

# ФАНАТ СПОРТУ КАРЧЭЎСКІ

*Карчэўскі Уладзімір Максімавіч нарадзіўся 17 ліпеня 1943 года ў вёсцы Клепачы Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці. Бацькі — сяляне. 1950 — 1960 гг. - вучань Кляпачскай сярэдняй школы. 1960-1964 гг. — студэнт Беларускага дзяржаўнага ардэнаноснага інстытута фізічнай культуры. 1964-1970 гг. — выкладчык Гродзенскага тэхнікума фізічнай культуры, старшы выкладчык Гродзенскага медыцынскага інстытута. 1970-1983 гг. — загадчык кафедры фізічнага выхавання Гродзенскага педагагічнага інстытута і універсітэта. 1983 — 1987 гг. — выкладчык валейбола і кансультант па валейболу Алжырскай Рэспублікі. З 1987 г. — дырэктар Гродзенскага тэхнікума фізічнай культуры. З 1994г. — дэкан факультэта фізічнай культуры Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь (1989 г.). Выдатнік фізічнай культуры СССР. Выдатнік асветы Рэспублікі Беларусь. Суддзя вышэйшай нацыянальнай катэгорыі па валейболу. Камісар Еўрапейскай канфедэрацыі валейбола. Узнагароджаны Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета БССР (1980 г.), медалём Міністэрства моладзі і спорту Алжырскай Рэспублікі. Дацэнт.*

**- Адкуль у Вас, вясковага хлопца, з'явілася цяга да фізічнай культуры і спорту?**

- Вялікі ўплыў на мяне аказаў настаўнік фізічнай культуры Кляпачскай сярэдняй школы Я.А. Мароз. Ён быў любімцам усёй школы. Акрамя дасягненняў у спорце, ён выдатна маляваў, спяваў, нават кіраваў школьным хорам.

Так павялося ужо ў школе, што я выступаў на раённых і абласных спаборніцтвах па многіх відах спорту. Пры гэтым дасягнуў вышынь другога разраду па валейболу, лёгкай атлетыцы, плаванні. Самай вялікай радасцю для мяне была перамога зборнай Гродзенскай вобласці па валейболу на кубак ЦК ЛКСМБ. У той час я вучыўся ў 9 класе.

**- Чым запомніўся Вам перыяд дзяцінства і юнацтва?**

- З дзяцінствам і юнацтвам звязана шмат успамінаў. Помняцца расказы пра вайну. Бацька з вайны вярнуўся інвалідам, быў цяжка паранены ў 70 км ад Берліна разрывам снарада.

Запомнілася цяжкая сялянская праца, добрыя ўспаміны засталіся аб Кляпачскай школе і яе педагагічным калектыве.

*"Для мяне У.М.Карчэўскі — гэта, папершае, прыклад для пабудовы асабістага лёсу. Мой трэнер і чалавек, які аказаў вялікі ўплыў на развіццё маёй асобы. Валодае выдатнымі арганізатарскімі здольнасцямі. У.М. Карчэўскі — фанат спорту".*

**Сяргей КІРЫЛАЎ,**
**старшы выкладчык.**

**- Хто для Вас з'яўляецца прыкладам у жыцці?**

- Найбольшы ўплыў на мяне аказаў доктар педагагічных навук, прафесар, трэнер Андрэй Івойлаў (г.Мінск). Мне імпанавалі многія выдатныя якасці і трэнера Мікалая Карполя. Цаню ў людзях высокі інтэлект, узровень культуры. Я патрабую ад сваіх падначаленых наяўнасці ўмення працаваць з калектывам, а ў спартыўным калектыве работа трэнера вельмі цяжкая. Не люблю, калі ў асобных трэнераў і выкладчыкаў бываюць "любімчыкі".

**- Вы спрабавалі сябе ў некалькіх відах спорту. Аднак бадмінтон быў тым накірункам, у якім Вы дасягнулі значных поспехаў.**

- Так. Я з'яўляюся кандыдатам у майстры спорту па бадмінтону. З 1962 па 1965 гг. ніхто не перамог мяне ў Беларусі па бадмінтону. Пачынаючы з 1961 г., маім асноўным кумірам быў Ю.А. Гагарын. Я прачытаў у друку, што бадмінтон з'яўляецца гульнёй касманаўтаў, якая выпрацоўвае выдатныя якасці, і вырашыў авалодаць гэтай гульнёй дасканала, што мне і ўдалося.

**- Як Вы ацэньваеце калектыў свайго факультэта?**

- Я лічу, што на факультэце фізічнай культуры склаўся вельмі добры калектыў. На факультэце вучацца студэнты, якія паказваюць значныя спартыўныя дасягненні. Бывае так, што пра нашых студэнтаў з іроніяй гавораць: "Мышцаў многа, а розуму ...". Гэта не адпавядае рэчаіснасці, не ўсе ва універсітэце ўяўляюць сабе, што значыць спалучаць спорт і вучобу. Спорт, я кажу пра сур'ёзны спорт, - гэта адмаўленне ад многіх радасцяў жыцця. Спорт патрабуе пэўнага рэжыму харчавання. Пастаянныя заняткі спортам на працягу многіх гадоў магчымы толькі пры наяўнасці моцнай волі і характару.

Нашых студэнтаў вучаць выдатныя выкладчыкі, такія, як А.Валчэцкая, прафесары У. Баркоў, А. Яроцкі, заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь М. Бура, кандыдаты педагагічных навук А. Навойчык і дацэнт Г. Гайдашаў і іншыя.

*"Дэкан Карчэўскі — класны мужык. Усе студэнты ўспрымаюць яго як аўтарытэтную асобу. Цэнім яго арганізатарскія здольнасці, асабліва імпануе ў асобе Карчэўскага пачуццё гумару, што, наогул, адсутнічае ў некаторых выкладчыкаў. Карчэўскі для мяне - фігура важкая".*

**Аляксандр ЛЫНЬКО,**
**студэнт 4 курса**
**факультэта фізічнай культуры.**

**- Вы працавалі і працуеце на розных пасадах — загадчык кафедры, дырэктар тэхнікума, трэнер зборнай каманды вобласці па валейболу, дэкан. Што галоўнае ў развіцці спорту ў навучальнай установе?**

- Па-першае, патрэбна сур'ёзная канцэпцыя развіцця фізічнай культуры і спорту ў навучальнай установе. Адзін з варыянтаў такой канцэпцыі распрацаваны выкладчыкамі факультэта фізічнай культуры і зацверджаны на Савеце універсітэта. Па-другое, патрэбна і дапамога спорту і спартсменам на ўсіх узроўнях. Напрыклад, мяне пасля ўдалых выступленняў на абласных і рэспубліканскіх спаборніцтвах запрашалі вучыцца ў медыцынскі інстытут, у педагагічныя інстытуты. Сёння студэнт-спартсмен на іншых факультэтах не заўсёды атрымлівае падтрымку выкладчыкаў. Па-трэцяе, патрэбна наяўнасць матэрыяльнай базы. Я асабіста кіраваў будоўляй спартыўнага зала еўрапейскага класа па вуліцы Захарава. З вялікімі цяжкасцямі пабудавалі суперсучасныя тэнісныя корты. У нашых планах - пабудова басейна.

**- Вы былі 4 гады выкладчыкам валейбола Інстытута тэхналогіі спорту Алжырскай Рэспублікі. Чым запомніліся Вам гэтыя гады?**

- За сваё спартыўнае жыццё я быў у многіх замежных краінах. Лягчэй пералічыць, дзе я не быў: гэта ў краінах амерыканскага кантыненту, Англіі і Японіі.

У перыяд працы ў Алжыры мне давялося таксама працаваць кансультантам-трэнерам нацыянальнай зборнай Алжыра па валейболу. Я быў бы і цяпер вельмі задаволены, калі б пашыраліся сувязі спартсменаў нашага універсітэта з ВНУ розных краін свету.

**- Ці задаволены Вы ўвагай рэктарата Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы да развіцця фізічнай культуры?**

- У асноўным задаволены. Рэктар С.А. Маскевіч часта бывае на нашым факультэце. Ён пастаянна трэніруецца на тэнісных кортах. Не мінаюць нас увагай і прарэктары. Практычна ўсе нашы асноўныя пытанні вырашаюцца.

*"Карчэўскі наўрад ці можа ўявіць сябе па-за спортам. Ён - чалавек вельмі шырокай натуры, якому можна адкрыць душу, паплакацца "у хустачку" аб сваіх праблемах, і ён заўсёды дапаможа. Людзі вельмі цэняць дэкана Карчэўскага як арганізатара спорту. На факультэце пануюць парадак і дысцыпліна".*

**Ганна НАВІЦКАЯ,**
**сакратар дэканата факультэта**
**фізічнай культуры.**

**- Што Вам хацелася б пажадаць чытачам газеты "Гродзенскі універсітэт"?**

- Жадаю далучацца да фізкультуры і спорту ў магчымых для Вас месцах. Кожны пражыты дзень можа быць залічаны ў актыў пры ўмове, што некалькі хвілін прысвечана фізічнай культуры.

**Матэрыял падрыхтаваны**
**прафесарам Віктарам ТАРАНЦЭЕМ.**

*Да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР*

# АКТ ВЯЛІКАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ ЗНАЧНАСЦІ

**І. КОЎКЕЛЬ, І. КРЭНЬ**

Раніцай 17 верасня 1939 года Чырвоная Армія перайшла савецка-польскую граніцу. Аперацыя ажыццяўлялася сіламі двух франтоў: Беларускага - пад камандаваннем камандарма другога ранга М.П.Кавалёва і Украінскага - пад камандаваннем камандарма першага ранга С.К. Цімашэнка. Ужо ў першы дзень наступлення савецкія войскі вызвалілі Баранавічы, 18 верасня - Навагрудак, Ліду, Слонім, 19 - Вільню, Пружаны, 20 - Гродна, 21 - Пінск, 22 верасня - Беласток і Брэст. Да 25 верасня ўся тэрыторыя Заходняй Беларусі была занята савецкімі войскамі.

У некаторых раёнах Заходняй Беларусі яшчэ да прыходу Чырвонай Арміі пад кіраўніцтвам былых членаў КПЗБ былі створаны ваенна-рэвалюцыйныя камітэты і ўзброеныя атрады з рабочых і сялян. Яны бралі ўладу ў свае рукі, займалі чыгуначныя лініі, масты і ўтрымлівалі іх да прыходу часцей Чырвонай Арміі. Там, дзе ў гэтым узнікала неабходнасць, ствараліся і партызанскія атрады. У баях за вызваленне Гродна ўдзельнічаў партызанскі атрад пад кіраўніцтвам токара І.Д. Індушка, у раёне Дзярэчына і Зэльвы дзейнічаў партызанскі атрад пад камандаваннем А.С. Мазіка. У Пінскай і Янаўскай гмінах на Палессі дзейнічаў партызанскі атрад, які ўзначальваў А.І. Прыступа. Ён заняў чыгуначныя станцыі Юхновічы і Малаткевічы, устанавіў кантроль за чыгуначнай магістраллю Брэст - Гомель і шашой Брэст - Пінск, утрымліваючы іх да прыходу савецкіх войск. У Скідзелі сяляне 18 верасня раззброілі паліцыю, занялі пошту, магістрат, чыгуначную станцыю і электрастанцыю. Іх дзеяннямі кіраваў рэўком, у склад якога ўваходзілі былыя члены КПЗБ М.Літвін, Р. Шагун, І. Мышко і інш.

Узброеныя выступленні мясцовага насельніцтва супраць польскіх уладаў мелі месца 18-19 верасня таксама ў мястэчках Астрына, Азёры, Лунна і іншых населеных пунктах Гродзеншчыны. У Астрына і Азёрах яны былі жорстка падаўлены праходзіўшымі тут часцямі польскай арміі, у прыватнасці, кавалерыйскай брыгадай «Ваўкавыск» пад камандаваннем палкоўніка Эдмунда Гелдут-Тарнасевіча. Усе паўстанцы, захопленыя пры супраціўленні польскім уладам, былі расстраляны, а дамы іх спалены.

Па меры вызвалення Заходняй Беларусі ў ваяводскіх і павятовых цэнтрах ствараліся часовыя ўпраўленні, у вёсках і мястэчках - сялянскія камітэты. У іх склад уваходзілі актывісты з мясцовага насельніцтва і прадстаўнікі Чырвонай Арміі. Для падтрымання парадку на месцах у гарадах ствараліся атрады рабочай гвардыі і грамадзянскай міліцыі, у вёсках - сялянскай міліцыі.

Часовыя ўпраўленні і сялянскія камітэты наладжвалі забеспячэнне насельніцтва прадуктамі харчавання, медыцынскае абслугоўванне, сачылі за арганізацыяй гандлю, вялі барацьбу з спекуляцыяй, адкрывалі школы, размяркоўвалі жыллё, арганізоўвалі работу прамысловых прадпрыемстваў, пошты, тэлеграфа, транспарту, вялі вялікую палітыка-выхаваўчую работу. Важнейшай задачай часовых упраўленняў і сялянскіх камітэтаў на вёсцы было вырашэнне аграрнага пытання. Не чакаючы заканадаўчых актаў, сялянскія камітэты адразу ж прыступілі да раздзелу памешчыцкіх і царкоўных зямель і маёмасці іх уладальнікаў. У выніку гэтых акцый беззямельныя і малазямельныя сяляне, батракі атрымалі 431 тыс. га зямлі, 14 тыс. коней і 33,4 тыс. кароў. Выдавалася і насенне для пасеваў.

Але часовыя ўпраўленні і сялянскія камітэты не маглі вырашыць пытанні аб форме дзяржаўнай улады і заканадаўчым замацаванні праведзеных пераўтварэнняў. Гэтыя пытанні мог вырашыць толькі вышэйшы заканадаўчы орган краю, выбраны яго насельніцтвам. Такім органам стаў Народны (Нацыянальны) сход Заходняй Беларусі, выбары якога праходзілі 22 кастрычніка 1939 г. па прапанове Часовага ўпраўлення г. Беластока. Ім папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа.

Кандыдатамі ў дэпутаты Народнага сходу насельніцтва называла тых, хто тут ў гады польскага панавання вёў актыўную рэвалюцыйную барацьбу. Ім рабочыя і сяляне давалі наказы, у якіх патрабавалі ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР і ўваходжання яе ў склад СССР, устанаўлення на яе тэрыторыі Савецкай улады, нацыяналізацыі прамысловасці, банкаў, транспарту, сувязі і канфіскацыі памешчыцкіх земляў.

Народны (Нацыянальны) сход Заходняй Беларусі праходзіў у Беластоку 28-30 кастрычніка 1939 года. На ім абмяркоўваліся 4 пытанні: аб дзяржаўнай уладзе, аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР, аб зямлі, аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці. Абмеркаваўшы першае пытанне, Народны сход прыняў «Дэкларацыю аб дзяржаўнай уладзе», у якой абвясціў, што «уся ўлада на тэрыторыі Заходняй Беларусі належыць працоўным горада і вёскі ў асобе Саветаў дэпутатаў працоўных». У «Дэкларацыі аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР», прынятай па другім пытанні, Народны сход звярнуўся з просьбай да Вярхоўных Саветаў СССР і БССР прыняць Заходнюю Беларусь ў склад СССР і БССР, «каб уз'яднаць беларускі народ у адзіную дзяржаву і пакласці тым самым канец раз'яднанню беларускага народа». Каб хутчэй вырашыць гэтыя пытанні, Народны сход выбраў Паўнамоцную камісію ў складзе 66 чалавек, якой было даручана перадаць Вярхоўным Саветам СССР і БССР яго рашэнні і волю насельніцтва Заходняй Беларусі.

У «Дэкларацыі...», прынятай па пытанні аб зямлі, абвяшчалася аб канфіскацыі і перадачы без выкупу памешчыцкіх і царкоўных зямель з усім інвентаром сялянам, а ўся зямля з яе нетрамі, лясамі і рэкамі абвяшчалася ўсенароднай уласнасцю. Была прынята таксама «Дэкларацыя аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці».

Адразу ж пасля Народнага сходу Паўнамоцная камісія выехала ў Маскву на V нечарговую сесію Вярхоўнага Савета СССР першага склікання. 2 лістапада 1939 года сесія, заслухаўшы заяву Паўнамоцнай камісіі, пастанавіла: «Задаволіць просьбу Народнага сходу Заходняй Беларусі і ўключыць Заходнюю Беларусь у склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік з уз'яднаннем яе з Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай».

*(Друкуецца ў скарачэнні).*

# У ГОНАР ЮБІЛЕЮ

У рамках 60-годдзя ўз'яднання Беларусі ў нашым універсітэце праводзіліся мерапрыемствы, прысвечаныя гэтай падзеі. 16 верасня прайшоў адзіны дзень інфармавання. У рамках 60-годдзя ўз'яднання праводзіліся сустрэчы студэнтаў з ветэранамі падполля і Вялікай Айчыннай вайны. Запомніцца, напрыклад, сустрэча з удзельнікам тых падзей Міхаілам Максімавічам Серадой, якую правеў філалагічны факультэт.

Юбілейнай даце прысвячаліся таксама спартыўныя мерапрыемствы — асеннi легкаатлетычны крос і іншыя. Дэлегаты ад універсітэта бралі ўдзел таксама ў пасяджэнні за «круглым сталом», якое арганізавала ўпраўленне па друку і інфармацыі аблвыканкама.

Усе гэтыя падзеі, безумоўна, застануцца ў памяці студэнтаў, будуць садзейнічаць развіццю пачуцця нацыянальнай самасвядомасці і патрыятызму.

# ДЗЕСЯЦЬ ГАДОЎ

прайшло з дня адкрыцця кафедры польскай філалогіі ў нашым універсітэце. Гэтай даце былі прысвечаны ўрачыстае пасяджэнне і навуковая канферэнцыя, якія праходзілі 15-18 верасня.

Урачыстая частка праходзіла ў актавай зале філалагічнага корпуса па вуліцы Леніна. Вяла яе загадчык кафедры польскай філалогіі, прафесар, доктар філалагічных навук Святлана Піліпаўна Мусіенка - стваральнік і душа кафедры. Ва ўрачыстасцях удзельнічалі прадстаўнікі Рэспублікі Польшча, кіраўніцтва універсітэта. З прывітаннем да ўдзельнікаў канферэнцыі выступіў рэктар Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта С.А. Маскевіч, амбасадор Рэспублікі Польшча па Беларусі М. Мацкевіч, Надзвычайны Упаўнаважаны Пасол Рэспублікі Беларусь у рэспубліцы Польшча В.І. Бурскі, прарэктар па навуковай працы ГрДУ В.В. Сянько і іншыя, у тым ліку студэнты і аспіранты кафедры. Затым з дакладам на тэму «10 гадоў кафедры польскай філалогіі» выступіла загадчык кафедры польскай філалогіі, прафесар, доктар філалагічных навук С.П. Мусіенка. Пасля дакладу быў паказаны фільм пра Адама Міцкевіча.

Навуковая канферэнцыя, прысвечаная юбілею кафедры польскай філалогіі, працягвалася тры дні і ўключала ўрачыстае адкрыццё канферэнцыі, пасяджэнне "круглага стала", канцэрт у актавай зале, пастаўлены сіламі студэнтаў, а таксама секцыйныя пасяджэнні, сяброўскую вячэру і выезд удзельнікаў канферэнцыі ў Навагрудак.

# АБІТУРЫЕНТ – 99: аналіз вынікаў работы прыёмнай камісіі

План прыёму абітурыентаў на дзённую бюджэтную форму навучання на 1999/2000 навучальны год складаў 922 месцы. Было пададзена 1938 заяў. Уступныя экзамены і сумоўе вытрымалі 1253 чалавекі, з іх 68 медалістаў з мэтавым накіраваннем і 13 чалавек - па рэкамендацыі ў межах 20 працэнтаў. Залічаны 922 чалавекі, у тым ліку - 120 чалавек без іспытаў, 58 - пасля АДП.

Прыёмнай камісіяй універсітэта, якая створана загадам рэктара, праведзена значная работа. Вось толькі некаторыя мерапрыемствы. Праведзены тры арганізацыйныя сходы з абітурыентамі, дзе яны падрабязна азнаёмлены з парадкам правядзення ўступных іспытаў. Падрыхтаваны і выдадзены даведнік «Абітурыент-99» і спецвыпуск газеты «Гродзенскі універсітэт» з аналагічнай назвай. Змест апублікаваных нарматыўных дакументаў і інструктыўных матэрыялаў своечасова быў даведзены да ведама членаў прадметных экзаменацыйных камісій і абітурыентаў. З экзаменатарамі праводзіліся і інструктыўныя нарады па пытаннях арганізацыі і правядзення ўступных экзаменаў і сумоўя з абітурыентамі.

Уся неабходная інфармацыя аб Правілах прыёму ў Гродзенскі універсітэт, а таксама аб парадку правядзення ўступных іспытаў была своечасова вывешана на стэндах ПК, якія знаходзіліся як у галоўным корпусе універсітэта, так і каля яго. З 2 па 12 ліпеня для абітурыентаў былі арганізаваны платныя падрыхтоўчыя курсы. Напярэдадні ўступных экзаменаў у абавязковым парадку праводзіліся кансультацыі.

Праведзена вялікая прафарыентацыйная работа: сустрэчы з выпускнікамі СШ і педагагічных вучылішчаў - усяго 24 сустрэчы. З 24 сакавіка па 1 красавіка бягучага года штодзённа праводзіліся Дні адкрытых дзвярэй.

Выкладчыкі універсітэта прымалі актыўны ўдзел у правядзенні раённых і абласных алімпіяд, а таксама алімпіяд, якія праводзіў наш універсітэт. Прыёмная камісія распрацавала Палажэнне аб правядзенні алімпіяд і конкурсаў ГрДУ, якое было зацверджана першым намеснікам міністра ад 08.02.1999 года. У адпаведнасці з гэтым Палажэннем і Правіламі прыёму ў Гродзенскі універсітэт былі арганізаваны і праведзены алімпіяды па матэматыцы, фізіцы, інфарматыцы, хіміі, беларускай мове і літаратуры, рускай мове і літаратуры, а таксама конкурс выканаўчага майстэрства. У вочных турах, якія праводзіліся 14, 21 і 25 сакавіка 1999 года, прынялі ўдзел 285 выпускнікоў сярэдніх навучальных устаноў (у 1998 годзе - 172). З іх 101 (34,5%) былі прызнаны пераможцамі (у 1998 годзе - 57 (31,1%)).

Пры паступленні ў наш універсітэт на адпаведныя спецыяльнасці ўсе яны карысталіся льготамі, якія былі прадугледжаны Правіламі прыёму. У выніку ў лік студэнтаў дзённай бясплатнай формы навучання былі залічаны 70 абітурыентаў без уступных экзаменаў і яшчэ 13, якім была выстаўлена адзнака «5» па адпаведных прадметах. Такім чынам 83 абітурыенты паспяхова выкарысталі вынікі свайго ўдзелу ў алімпіядах ГрДУ, што складае 9,2% ад плана прыёму на дзённае аддзяленне. Акрамя таго, яшчэ 1 абітурыент быў залічаны на завочную форму навучання.

З мэтай апрабацыі новых метадаў ацэнкі якасці падрыхтоўкі будучых абітурыентаў загадам Міністра адукацыі РБ «Аб цэнтралізаваным тэсціраванні выпускнікоў агульнаадукацыйных устаноў РБ» за № 175 ад 02.04.1999 года Гродзенскаму універсітэту было дзручана правядзенне тэсціравання на добраахвотнай падставе з боку будучых абітурыентаў, якое і было праведзена ў маі гэтага года. Тэсціраванне праводзілася па трох прадметах: па фізіцы, па матэматыцы і па рускай мове.

Прыёмным камісіям вну, спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў было рэкамендавана залічваць вынікі такога тэсціравання ў якасці вынікаў уступных экзаменаў.

Наш універсітэт таксама залічваў вынікі цэнтралізаванага тэсціравання. Па фізіцы (вусна) на спецыяльнасці: фізіка, радыёфізіка; прыборабудаванне; тэхналогія і абсталяванне высокаэфектыўных тэхналогій працэсаў апрацоўкі матэрыялаў.

Па матэматыцы (пісьмова) на спецыяльнасці: матэматыка; фізіка; радыёфізіка; прыборабудаванне; тэхналогія і абсталяванне высокаэфектыўных тэхналогій працэсаў апрацоўкі матэрыялаў.

Па рускай мове і літаратуры (пісьмова) на ўсе спецыяльнасці, акрамя спецыяльнасцяў: эканамічная кібернетыка; сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны; эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве; камерцыйная дзейнасць; бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт.

Усяго ў тэсціраванні прынялі ўдзел 183 чалавекі. З іх: па фізіцы - 20, па матэматыцы - 73 і па рускай мове - 90.

Прасілі залічыць вынікі тэсціравання ў якасці вынікаў уступных экзаменаў 51 абітурыент, з іх 42 сталі студэнтамі ГрДУ.

Вынікам правядзення значнай арганізацыйнай і прафарыентацыйнай работы было тое, што практычна на ўсе спецыяльнасці быў даволі значны конкурс. Так, на дзённым аддзяленні на бясплатную форму навучання пры плане прыёму ў 900 чалавек было пададзена 1936 заяў. А гэта дало агульны конкурс 2,15 чалавекі на месца (у 1998 годзе - 2,14 чалавекі на месца).

Трэба адзначыць, што ў гэтым годзе рэзка павысіўся конкурс на такія спецыяльнасці, як прыборабудаванне і тэхналогія і абсталяванне высокаэфектыўных працэсаў апрацоўкі матэрыялаў - з 1,28 у 1998 да 2,075 у 1999 годзе і прыкладная матэматыка - з 1,95 да 3. Што тычыцца конкурсу на іншыя спецыяльнасці, то ён за апошнія гады з'яўляецца больш-менш стабільным. Відавочна, што конкурсную сітуацыю неабходна ўлічваць пры распрацоўцы плану прыёму на будучы год.

Уступныя экзамены ў гэтым годзе праводзіліся ў наступныя тэрміны:

па завочнай і вячэрняй формах навучання - з 30 чэрвеня па 10 ліпеня;

па дзённай форме навучання - з 16 па 30 ліпеня.

Для правядзення ўступных іспытаў па ўсіх відах прыёму было створана 13 прадметных экзаменацыйных камісій.

Агульны малюнак прыёму ва універсітэт у 1999 годзе выглядае наступным чынам:

- на завочную і вячэрнюю формы навучання па бюджэту і на дагаварной аснове ўступныя іспыты здавалі 628 абітурыентаў. Вытрымалі іх 441 чалавек, што складае 70,2%. У 1997 годзе - 53,3%, у 1998 годзе - 60,2%;

- на дзённую форму навучання па бюджэту ўступныя іспыты здавалі 1057 абітурыентаў. Сярод іх было 467 медалістаў, што складае 23,9%. Уступныя іспыты вытрымалі 1288 чалавек, што складае 68,5%. У мінулым годзе - 62,1%.

Усяго ж па дзённай форме навучання было праведзена 4680 чалавека-экзаменаў.

Па выніках правядзення ўступных экзаменаў старшынямі прадметных экзаменацыйных камісій былі прадстаўлены справаздачы, у якіх адзначаюцца станоўчыя і пазітыўныя аспекты ведаў абітурыентаў, выказваецца цэлы шэраг недахопаў і заўваг да падрыхтаванасці паступаючых, ёсць шмат цікавых думак і прапаноў, а таксама выказваюцца адпаведныя парады і пажаданні па ўдасканаленні арганізацыі прыёму ва універсітэт. Таму, каб гэты каштоўны вопыт быў выкарыстаны ў будучым належным чынам, мэтазгодна вынікі ўступных экзаменаў абмеркаваць на кожным факультэце, выпрацаваць адпаведныя прапановы і вынесці іх на разгляд ПК.

У адпаведнасці з Правіламі прыёму ў Гродзенскі дзяржуніверсітэт на 1999 год выпускнікі сярэдніх школ, якія паступалі на педагагічныя спецыяльнасці дзённай формы навучання па мэтавых накіраваннях і мелі залаты ці сярэбраны медаль, маглі быць залічаны па выніках сумоўя па вызначаных для медалістаў прадметах уступных экзаменаў, якое праводзілася 16 ліпеня. Калі ж яны не былі рэкамендаваны да залічэння па выніках сумоўя, то яны маглі здаваць уступныя экзамены і пры ўмове іх паспяховай здачы маглі ўдзельнічаць у конкурсе на выдзеленыя мэтавыя месцы. У выпадку, калі такія абітурыенты не праходзілі па конкурсе на мэтавыя месцы, то яны маглі ўдзельнічаць у агульным конкурсе. Пры гэтым, як і ў мінулым годзе, на мэтавыя месцы маглі быць залічаны толькі абітурыенты, якія заключылі кантракт.

Пры плане мэтавага прыёму на педагагічныя спецыяльнасці ў 220 чалавек, што склала 34,6% (у 1998 годзе - 37,6%) ад агульнага плана прыёму ў 636 чалавек было пададзена ўсяго 315 заяў. Гэта дало конкурс сярод мэтавікаў 1,43 чалавекі на месца - крыху больш, чым у мінулым годзе (1,2 чалавекі на месца). Але ж і гэтага яўна недастаткова, бо пасля ўступных іспытаў заставаліся незакрытымі яшчэ 37 мэтавых месцаў. У мінулым годзе такіх месцаў было аж 63. Таму, каб не страціць гэтыя 37 месцаў для універсітэта, прыёмная камісія сумесна з абласным упраўленнем адукацыі правяла значную работу, у выніку чаго на гэтыя месцы былі афармлены дадатковыя кантракты з абітурыентамі, якія вытрымалі ўступныя экзамены. Такім чынам план мэтавага прыёму аказаўся выкананы на 100%.

Што тычыцца мэтавікаў-медалістаў, якія маглі быць залічаны па выніках сумоўя, то з 126 мэтавікаў толькі 67 (53,2%) пацвердзілі свае медалі і былі рэкамендаваны да залічэння. У 1997 годзе такі паказчык складаў 60,1%, у 1998 - 70,1%. Адсюль вынікае, што падрыхтоўка мэтавікаў-медалістаў у гэтым годзе была даволі нізкай.

Разам з тым трэба адзначыць другі год запар вельмі высокую падрыхтоўку мэтавікаў-медалістаў Зэльвенскага раёна. Так, з 6 месцаў, на якія прэтэндавалі мэтавікі-медалісты з гэтага раёна, аказаліся запоўненымі па выніках сумоўя ўсе 6.

За ўвесь перыяд правядзення ўступных іспытаў было пададзена толькі 14 апеляцый. З іх задаволены - 6.

Аналіз вынікаў разгляду апеляцый паказвае, што адзнакі на ўступных экзаменах па ўсіх прадметах, акрамя матэматыкі, былі

# СПОРТИВНЫЙ КАЛЕЙДОСКОП

РУБРИКУ ВЕДЕТ СТАРШИЙ ПРЕПОДАВАТЕЛЬ КАФЕДРЫ ФИЗВОСПИТАНИЯ О. СМОЛЯКОВ

## "СЕРЕБРО" ГАНДБОЛИСТОК

Минск был местом проведения финальных игр по гандболу женских команд в программе студенческих игр 1999 года.

Шесть сильнейших команд вузов страны вели спор за почетный трофей, медали и дипломы министерства.

Наши девчата нанесли поражение студенткам Гомельского университета - 26:24, Могилевского университета - 26:22, Брестского университета - 37:17, команде политехнической академии - 38:11 и в упорном поединке уступили академии физической культуры - 18:25 и стали серебряными призерами соревнований. Радость победы разделяет и тренер команды, заслуженный тренер республики, старший преподаватель кафедры спортивных игр М.Ф.Бура. Чемпионами стали студентки академии физической культуры, «бронза» - у гомельчанок.

Лучшими игроками в нашей команде были Е.Козловская (вратарь), первокурсницы А.Почерелко, Н.Плотанович и выпускница этого года А.Сидорик.

Впереди у нашей команды I тур чемпионата страны в высшей лиге, который пройдет в октябре в Минске.

## ТУРНИР ПО ВОЛЕЙБОЛУ

В международном турнире по волейболу среди женских команд, посвященном памяти нашего земляка, генерала армии Алексея Иннокентьевича Антонова, пять команд вели спор за памятный трофей и среди них гродненская команда «Неман-КСМ» (тренер А.Рудь).

Наши девушки последовательно нанесли поражение команде «Атлант» из Барановичи - 3:2, затем победили с одинаковым счетом 3:1 команды «Белбизнесбанк» из Минска и команду «Киминис» из латвийского города Даугавпилса и команду «Ахема» из Литвы - 3:0.

В суперфинале за приз встретились «Неман-КСМ» и «Белбизнесбанк». Упорный был поединок. Со счетом 3:0 (23:25, 26:28, 28:30) победили минчанки. «Серебро» завоевали наши девчата. За команду выступали студентки нашего университета: Н.Пакуцевич и Н.Манькова (факультет экономики и управления), К.Демидик (факультет психологии и педагогики), Н. Антонович (юрфак) и Е.Лазорина, Т.Ванюкевич, Н.Скобля (все из факультета физической культуры).

Лучшими игроками турнира названы наши землячки Наталья Пакуцевич и Татьяна Обуховская. Им вручены памятные призы.

## ПАМЯТИ ПЕТРА ПОЧЕНЧУКА

Свято чтят в нашей стране память мастера спорта международного класса по спортивной ходьбе, чемпиона СССР, неоднократного рекордсмена мира, серебряного призера Олимпиады-80 в Москве, старшего преподавателя Гродненского госуниверситета имени Янки Купалы. В его память проводится мемориал по спортивной ходьбе. Вот и сейчас свыше ста спортсменов из всех областей нашей страны приняли участие в VIII мемориале в г. Гродно. Из гродненцев лучший результат показал ветеран легкой атлетики, который выступал еще с Петром Поченчуком - Александр Масловский, который победил на километровой дистанции.

На остальных дистанциях победили члены сборных команд Республики Беларусь.

Участники соревнований, тренер и судьи возложили цветы на могиле Петра Поченчука.

# "ПЕРЛЫ" ИЗ СОЧИНЕНИЙ АБИТУРИЕНТОВ

Мама била Витьку часто, но мало.

Мама сказала мне вымыть шею до пояса.

Маяковский засунул руку в штаны и вынул оттуда самое дорогое, поднял его высоко и сказал: «Я - гражданин Советского Союза».

Мне очень нравится героиня романа Льва Толстого «Война и мир», особенно когда она танцует на балу со Штирлицем.

Мы не забудем тебя, наш любимый Тарас Бульба, за твое мужественное героичество.

На берегу реки доярка доила корову, а в воде отражалось все наоборот.

На картине нарисованы девочка, собака и ее бабушка.

На поле боя раздавались крики и стоны мертвецов.

На полу лежал и еле дышал труп, рядом сидела жена трупа, а брат трупа лежал в другой комнате без сознания.

Наполеон болел раком и умер на святой Елене.

Наташа была истинно русской натурой, очень любила природу и часто ходила на двор.

Недалеко от нашей деревни был помят овес, потому что там загорали кабаны.

Некрасов был прикован к постели раком.

Нос Гоголя наполнен глубочайшим содержанием.

О лени Обломова Гончаров написал целый роман.

Один раз за весь ход истории прихотливая природа создает такое удивительное сочетание атомов, имя которому - Горький.

Ольга гуляла с Ленским, но у них ничего не вышло.

Наши далекие предки делали революцию голыми, босыми, в лаптях.

Моя верная подружка - это друг Толик.

# СОВЕТЫ СТУДЕНТАМ ВЫПУСКНОГО КУРСА

Устроиться на работу даже по направлению вуза - полдела. Не успокаивайтесь тем, что вам гарантировано рабочее место. Получить его - мало. Надо еще удержаться и... сделать карьеру. Итак, Вы прошли собеседование. Поздравляем! Однако нового работника подстерегают сложности, о которых он даже не подозревает.

1. Не теряйте достоинства и перенимайте у коллег то, что считаете нужным.

2. Держите эмоции при себе. Обиды и выражение недовольства - удел неудачников.

3. Не старайтесь «прогнуться» перед начальством. Современные руководители оценивают работников в первую очередь по деловым качествам.

4. Не переживайте, если не смогли завязать дружеские отношения ни с кем из сослуживцев. Это не означает, что Вы не «вписались». Запомните: на работе друзей не бывает.

5. Забудьте о фразах «и так сойдет» или «сделаю потом», об отговорках типа «это вина не моя, а секретарши, Иванова, Петрова...» Ни отключенный факс, ни отсутствие на работе нужного человека не должно стать помехой в работе.

6. Если Вы перепробовали все возможные варианты и поняли, что выполнить поручение к указанному сроку невозможно, немедленно оповестите начальство.

7. Не повторяйте забытую детскую привычку: не ябедничайте. Забудьте фразу: а почему он (она) не делает, опаздывает и т.д? Подобные ссылки не потерпит ни один уважающий себя начальник. Отвечайте только за себя.

8. Научитесь воспринимать критику. Если Вы совершили ошибку, не старайтесь ее «замаскировать». Не теряя времени, попытайтесь исправить то, что еще можно.

9. Старайтесь делать все вовремя. Привычка засиживаться допоздна будет расценена, как недостаток, свидетельствующий о том, что Вы не можете справиться со своими поручениями вовремя.

10. Не пытайтесь имитировать бурную деятельность, не вмешивайтесь во все, чтобы почаще попадаться на глаза руководству. За этими приемами даже не очень опытный начальник быстрее заметит несостоятельность работника. А коллеги посмеются. Профессионалами считают тех, кто выполняет работу четко, без лишней шумихи и помпы.

11. И последнее. Никогда не выясняйте, кто сколько получает. Зарплата может обсуждаться только с начальством.



Осенний берег. Фотоэтюд.

### ГРОДНЕНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМЕНИ ЯНКИ КУПАЛЫ

**объявляет конкурс**
**на замещение вакантных должностей:**

- заведующего кафедрой математики и методики преподавания математики в начальной школе;
- заведующего кафедрой административного и международного права;
- профессора кафедры прикладной математики;
- профессора кафедры материаловедения и ресурсосберегающих технологий;
- доцента кафедры белорусского и русского языков и методик их преподавания в начальной школе;
- доцента кафедры белорусского и теоретического языкознания (3);
- доцента кафедры экологии;
- доцента кафедры общей физики;
- доцента кафедры белорусского языка;
- доцента кафедры административного и международного права;
- доцента кафедры дифференциальных уравнений и оптимального управления;
- старшего преподавателя кафедры белорусского и русского языков и методик их преподавания;
- старшего преподавателя кафедры общей физики;
- старшего преподавателя кафедры алгебры, геометрии и методики преподавания математики;
- старшего преподавателя кафедры спортивных игр;
- старшего преподавателя кафедры белорусского и теоретического языкознания;
- старшего преподавателя кафедры математики и методики преподавания математики в начальной школе.
- преподавателя кафедры педагогики;
- преподавателя кафедры спортивных игр.

**Срок конкурса - с 28.09.1999 по 27.10.1999 года.**

**Документы по конкурсу направлять по адресу: 230023, г. Гродно, ул. Ожешко, 22, университет. Ректору.**

# АСТРОПРОГНОЗ НА ОКТЯБРЬ

**ОВНЫ.** Не очень приятное начало месяца. Зато в середине Вы начнете пожинать плоды своего труда: сбудется заветное. Не переусердствуйте: возможны стрессы, риск простудных заболеваний.

**ТЕЛЬЦЫ.** Недостаток финансов. Недовольство собой и близкими. Порадует общение с друзьями. Перелом в профессиональном плане. То, что доставляло много проблем, станет удаваться легко и приносить результаты.

**БЛИЗНЕЦЫ.** Разочарование. Подводные камни. В учебе - успех, в личной жизни - взаимопонимание. И в то же время - тупиковые ситуации, нагромождение проблем.

**РАКИ.** Грусть осени. Для творческих натур она обернется находками и удачами, но в финансовом плане, увы, не принесет ничего. Зато много работы, интересной, захватывающей, плоды которой - в будущем.

**ЛЬВЫ.** Пора отдохнуть и Львам. Многие из них накануне нервного срыва. Расслабьтесь, посидите в уютном кафе с приятным человеком. Все утрясется. Не стоит доверять сомнительным людям.

**ДЕВЫ.** Пора привести в порядок дом и дела. До многого не доходили руки. Сейчас - самое время. Многих Дев ждут успехи в финансовых делах и на службе. Для тех, кто учится, возможны определенные успехи в тех науках, которые прежде давались с трудом.

**ВЕСЫ.** Счастливые, беззаботные Весы! Их месяц. Удача сопутствует в любви, в учебе, на работе. Только денег будет всегда немного не хватать.

**СКОРПИОНЫ.** Вы пожнете то, что сеяли давно и упорно, и, если помыслы Ваши не были чистыми в отношении окружающих, звезды Вам не позавидуют и помочь не смогут. Октябрь вынесет на гребне волны то, что Вы хотели спрятать от окружающих. Неприятности будут идти одна за другой, но они - результат Вашей деятельности.

**СТРЕЛЬЦЫ.** Путешествуйте. Только так Вы сможете избежать болезней и неприятностей. Вас ждет приятная неожиданность. Порадуют близкие. Стрельцы контактны и приветливы, а значит, многие дела смогут уладить именно сейчас.

**КОЗЕРОГИ.** Нехватка времени и денег. Небольшой приятный сюрприз. В целом октябрь не сулит неприятностей. Но все равно постерегитесь завистников.

**ВОДОЛЕИ.** Начинают сбываться Ваши мечты. Но Вы, конечно, ожидали большего. Довольствуйтесь малым, не ропщите. И фортуна повернется к Вам лицом.

**РЫБЫ.** Для многих представителей этого знака наступают перемены в жизни. Будьте мужественными, чтобы принять то, что Вы не можете изменить. Рядом с Вами - доброта, сердечность. Не «проморгайте»!


*Рэдактар Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА*

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. ЛП № 111 ад 29.12.97 г. Вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна.

*Набор і вёрстка:* **М. ВЕРСТАК, В. ЗАКРЭЎСКІ.**
*Фота:* **Ул. САРОКІН.**
*Карэктура:* **Н. ДУДКО.**

*Здадзена ў набор 20.09.99.*
*Падпісана да друку: 29.09.99. 15.00*
*Заказ № 106*

Аб'ём - 1 ум. друк. арк.
Наклад 500 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.



*Наш адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228. ☎ 72-08-17.*